**А.Я. Ляскоў**

# РАСПРАЦОЎКА ІДЭІ НАТУРАЛЬНАГА ПРАВА Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII СТ.

Дактрына, якую называюць “натуральным правам”, з’яўляецца важным ідэйным накірункам, што ўзнік у эпоху антычнасці і існуе да нашага часу. Дактрына натуральнага права не з’яўляецца проста тэорыяй права і канцэпцыяй яго ўзнікнення. Гэта — філасофская плынь, якая тлумачыць і вызначае становішча чалавека ў універсуме і грамадстве. З гэтага філасофскага вучэння выводзяцца прынцыпы і метады права[1]. Натуральнае права і Асветніцтва блізкія, але не ідэнтычныя ідэйныя накірункі. Суадносіны паміж імі ў тым, што чалавек эпохі Асветніцтва выкарыстаў адну з ужо існуючых тэорый рацыяналістычнага права для правядзення рэформ гуманітарнага характара, заснаваных на ідэйна-палітычных палажэннях.

Узаемадзеянне метадаў рацыяналістычнага натуральнага права, палітычных рэформ эпохі Асветніцтва і новых дасягненняў навукі і тэхнікі спрыяла актыўнай кадыфікацыі права ў Еўропе. Найбольш вядомымі кодэксамі законаў эпохі Асветніцтва з’яўляюцца “Allgemeines Prussisches Landrecht” 1794 г. (Агульнае ўлажэнне для прускіх земляў), “Code Civil” 1804 г. (французскае цывільнае права і спецыяльнае заканадаўства) і “Allgemeines Bürgerlisches Gesetzburg für die deutschen Erbländer” 1811 г. (Агульны цывільны кодэкс для спадчынных земляў Габсбургскага дома) Аўстрыі[2].

Вялікае значэнне для развіцця ідэй Асветніцтва і натуральнага права мелі работы Ш. Мантэск’е, С. Пуфендорфа, Х. Вольфа і іншых правазнаўцаў.

У развіцці ідэі натуральнага права ў Беларусі ў канцы XVIII ст. значная роля належала вучэнню фізіякратаў. Дактрына фізіякратаў стварыла шырокі інтэлектуальны накірунак у Рэчы Паспалітай. Такой папулярнасцю фізіякратычныя ідэі не карысталіся нідзе ў Еўропе, нават у Францыі, дзе нарадзілася гэтая дактрына[3].

Першымі прапагандыстамі фізіякратычных поглядаў у Вялікім Княстве Літоўскім былі некаторыя магнаты і прадстаўнікі заможнай шляхты. Гэта былі асобы, якія засвоілі прагрэсіўныя ідэі еўрапейскай навукі і рацыяналістычнай філасофіі.

Прыхільнікам фізіякратычнай навукі ў Беларусі быў Іякім Літавор Храптовіч (1729–1812 гг.). Ён быў стваральнікам і выбітным дзеячом Адукацыйнай камісіі, з 1793 г. – канцлерам Вялікага Княства Літоўскага.

І. Храптовіч нарадзіўся каля Навагрудка. Ён валодаў маёнткамі ў Шчорсах і Вішневе, у якіх правёў грунтоўную аграрную рэформу[4].

Найбольш поўна прававыя і палітычныя погляды І. Храптовіча прадстаўлены ў яго кнізе "Натуральнае права" (J. Chreptowicz. Prawo natury. W-wa, 1814). Пры аналізе грамадскага жыцця І. Храптовіч адзначаў наяўнасць у ім "натуральнага парадку", які ўстанаўлівае правы і абавязкі членаў грамадства[5]. Для таго, каб падтрымліваць парадак у супольным жыцці, паміж людзьмі заключаецца дамова. Набліжанасць закона да натуральнага права, на думку Іякіма Храптовіча, вызначае ступень яго справядлівасці.

Грамадства разглядалася І.Храптовічам, як і іншымі фізіякратамі, у якасці натуральнага арганізму, што складае частку прыроды. Чалавек становіцца карысным для грамадства і самаго сябе, калі ён праз свабоду, бяспеку, права ўласнасці знаходзіцца ў заканамернай сувязі з прыродай. "Якія ж ён можа мець абавязкі, не маючы правоў? Хіба прымусіш яго працаваць? Бо яго найкарыснейшыя здольнасці розуму, кемлівасць не падпарадкоўваюцца прымусу"[6]. Гэтая канцэпцыя дазваляе сцвярджаць, што ў цэнтры поглядаў І. Храптовіча – чалавек, яго здольнасці, інтарэсы, правы і абавязкі.

Адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў дактрыны фізіякратаў ў Вялікім Княстве Літоўскім быў Іеранім Страйноўскі, выдатны правазнаўца, эканаміст і дзяржаўны дзеяч. І. Страйноўскі (1752-1815 гг.) нарадзіўся на Валыні ў збяднелай шляхецкай сям'і. Ён атрымаў адукацыю ў навучальных установах каталіцкага манашаскага ордэна піяраў. У 1776 – 1780 выкладаў спачатку матэматыку, логіку, метафізіку, потым – натуральнае і палітычнае права, права народаў і палітычную эканомію ў Варшаўскім калегіюме. У 1780 г. І. Страйноўскі становіцца прафесарам кафедры натуральнага права Галоўнай школы Вялікага Княства Літоўскага. Ён удзельнічаў у працы Адукацыйнай камісіі, уваходзіў у склад Камісіі па падрыхтоўцы праектаў цывільнага і крымінальнага кодэксаў, быў адным з аўтараў статута Віленскага ўніверсітэта.

Асноўным творам І. Страйноўскага была "Навука аб натуральным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў", апублікаваная ў Вільні ў 1785 г.

Паводле І. Страйноўскага, з'явы грамадскага жыцця вывучаюць чатыры навуковыя дысцыпліны: натуральнае права, палітычнае права, палітычная эканомія і міжнароднае права. Важна адзначыць, што І. Страйноўскі сістэматызаваў кожную з гэтых дысцыплін. Гэта адрознівала яго вучэнне ад поглядаў французскіх фізіякратаў, якія сканцэнтравалі ўвагу на эканамічным

жыцці грамадства і амаль не закраналі праблемы натуральнага права, дзяржавы, дачыненняў паміж народамі і г.д.[7]

Асновай прававой канцэпцыі І. Страйноўскага было вучэнне аб натуральным парадку і вынікаючым з яго натуральным праве. Ён разглядаў натуральны парадак рэчаў, як адзінства фізічнага і маральнага парадку, г.зн. як спалучэнне законаў прыроды і грамадства.

Натуральнае права, на думку І. Страйноўскага, з’яўляецца сукупнасцю законаў, якія вынікаюць з натуральнага парадку. Яно застаецца абсалютным, вечным і нязменным. І. Страйноўскі меркаваў, што людзі могуць пазнаваць натуральныя законы і ў адпаведнасці з імі распрацоўваць грамадзянскія законы. Пры адступленні ад натуральнага права людзей спасцігаюць “страшэнныя наступствы і ўсялякія бедствы”[8].

Паводле І. Страйноўскага, натуральнае права, увасобленае ў пазітыўным праве, выяўляе вечныя і нязменныя патрабаванні чалавечай прыроды. Натуральнае права “нічога іншага не ўяўляе, акрамя натуральных правоў і абавязкаў чалавека”[9]. Да гэтых вечных і нязменных правоў і абавязкаў ён залічвае імкненне чалавека да самазахавання, задавальнення сваіх патрэбаў у ежы, жытле, працы і г.д.

І. Страйноўскі лічыў, што з натуральных правоў і абавязкаў асобнага чалавека вынікаюць натуральныя правы і абавязкі людзей у грамадстве. Сярод іх ён называў правы асабістай свабоды, абароны, узаемнай дапамогі, прыватнай уласнасці, што таксама з’яўляюца вечнымі і нязменнымі.

І. Страйноўскі адмаўляў магчымасць існавання людзей па-за грамадскімі сувязямі. Ён меркаваў, што грамадскі стан з’яўляецца натуральным для чалавека, бо жыццё ў грамадстве адпавядае чалавечай прыродзе.

У пытанні паходжання дзяржавы І. Страйноўскі прытрымліваўся тэорыі грамадскай дамовы. Ён лічыў, што першапачаткова людзі захоўвалі палажэнні натуральнага права і жылі ў згодзе. З ускладненнем структуры адносін паміж людзьмі і з’яўленнем уласнасці ўзніклі канфлікты і патрэбнасць у дзяржаве для падтрымання ўнутранай і знешняй бяспекі, аховы ўласнасці. Тым самым І. Страйноўскі выказаў думку аб залежнасці ўзнікнення дзяржавы ад развіцця матэрыяльнай вытворчасці і маёмасных дачыненняў.

Іеранім Страйноўскі разглядаў прынцыпы натуральнага права ў якасці крытэрыяў ацэнкі сацыяльна-палітычнага ладу ў дзяржаве. Ён, у прыватнасці, крытыкаваў магнацкую алігархію Рэчы Паспалітай, лічыў, што яна не адпавядае патрабаванням натуральнага права. Палітычным ідэалам І. Страйноўскага была канстытуцыйная манархія.

Выдатнымі прадстаўнікамі ідэй фізіякратаў і правазнаўцамі ў Беларусі ў канцы XVIII ст. таксама былі І. Масальскі, К. Багуслаўскі, А. Загурскі, А. Снядэцкі, Т. Астроўскі і інш.

Антоній Загурскі з'яўляўся адным з першых свецкіх прафесараў Віленскай акадэміі, дзе выкладаў цывільнае права. Найбольш поўна прававыя погляды А.Загурскага выкладзены ў яго прамове "Пра высакароднасць, неабходнасць і карысць юрыспрудэнцыі ці прававой разважлівасці" ў Віленскай акадэміі 21 ліпеня 1761 г., надрукаванай у тым жа годзе. А.Загурскі быў прыхільнікам натуральнага права, асновай якога ён лічыў Божы закон, як вечны і ўніверсальны закон Сусвету, да якога належыць дапасоўваць чалавечае заканадаўства. А. Загурскі вызначаў юрыспрудэнцыю як навуку аб Божых і чалавечых законах, што акрэсліваюць паняцце справядлівасці. Ён лічыў, што прававая адукацыя з'яўляецца неабходнай для ўсіх людзей, якія выконваюць грамадскія і дзяржаўныя абавязкі, асабліва для суддзяў. А. Загурскі выступаў за ўзвышэнне ролі прававой навукі і заканадаўства ў жыцці грамадства Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII ст.[10]

Андрэй Снядэцкі быў вядомы як хімік, урач, філосаф, асветнік. Ён нарадзіўся ў мястэчку Жнін Гнезненскага ваяводства ў сям'і дробнага прадпрымальніка. Андрэй Снядэцкі вучыўся ва ўніверсітэтах Кракава, Павіі, Эдынбурга. Больш за 40 гадоў жыў і працаваў у Вільні, быў прафесарам у Віленскім універсітэце.

А. Снядэцкі цікавіўся ўплывам многіх фактараў на жыццё і дзейнасць розных грамадскіх груп. Ён прытрымліваўся тэорыі натуральнага права, зыходзіў з чалавечай прыроды. Паводле вучэння А. Снядэцкага, дзяржава ўзнікла на дагаварной аснове, яе асноўнай мэтай з'яўляецца абарона правоў і ўласнасці кожнага чалавека. На думку Андрэя Снядэцкага, прыродныя ўласцівасці чалавечай натуры часам скажаюцца і не задавальняюцца з-за недахопу асветы. А. Снядэцкі меркаваў, што сацыяльныя ўмовы з'яўляюцца вядучым фактарам у фарміраванні асобы і яе жыццядзейнасці. Ён лічыў, што "спосаб жыцця пануючага класа вельмі блізкі ва ўсіх краінах і ва ўсіх кліматычных зонах. Пры наяўнасці ўсіх выгод <···> ён мяккі, бяздзейны і развязны; суровасць клімату не мае для яго ніякага значэння <···>, ён мае магчымасць засцерагчы сябе як ад залішняй спёкі, так і ад суровага холаду. Пастаянныя гулянкі, пышнасць <···>, узвышэнні і адзнакі пашаны, што падаграваюць славалюбства, трымаюць нервовую сістэму пастаянна ў стане празмерна павышанай дзейнасці, да чаго далучаюцца і іншыя фактары, што ўзбуджаюць нярвовую дзейнасць"[11]. Андрэй Снядэцкі крытыкаваў лад жыцця

пануючага класа, проціпастаўляў яму карысную здаровую працу. Ён спачуваў простаму народу – “літвінам”, цікавіўся іх жыццём.

---

[1] Аннерс Э. История европейского права. М., 1994. С. 217.

[2] Там жа. С. 229.

[3] Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии до 1917 г. Минск, 1973. С. 214.

[4] Похилевич Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века. Вильнюс, 1966. С. 134.

[5] Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии до 1917 г. С. 217.

[6] Там жа. С. 217.

[7] Там жа. С. 220-221.

[8] Там жа. С. 222.

[9] Там жа. С. 222.

[10] Мысліцелі і асветнікі Беларусі X-XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1995. С.215.

[11] Там жа. С. 314.